12-ы АК наступае далей цераз участак р. Ясельды на ўчастак р. Шчара і праводзіць зачыстку паміж дзвюма танкавымі трасамі.

У якасці галоўных напрамкаў баявой дзейнасці нямецкае камандаванне вызначае: 1) баі ў раёне р. Прыпяць; 2) пачатак праследу праціўніка ў напрамку р. Беразіна; 3) разгортванне бітвы пад Беластокам і Слонімам [11, Bl. 39–40].

Такім чынам, праведзенае даследаванне двухбаковых баявых дзеянняў у першыя тры дні вайны на тэрыторыі Беларусі сведчаць аб важнасці выкарыстання новых навуковых падыходаў для аб’ектыўнага асвятлення пачатку Вялікай Айчыннай вайны. Матэрыял паказвае. што нельга нічым замяніць дакументальныя звесткі, незалежна ад таго, у якіх гістарычных крыніцах яны адлюстраваны. Разгляд канкрэтных гістарычных фактаў, замацаваных у дзённіку баявых дзеянняў 2-й нямецкай ТГр, і тых гістарычных звестак, якія згаданы ва ўспамінах начальніка штаба 4-й арміі палкоўніка Л. М. Сандалава, пераконвае чытача ў тым, што больш дакладная карціна баявых падзей, што разгортваліся ў першыя тры дні вайны, пачала складацца нямецкімі храністамі, якія ў канкрэтнай прывязцы да мясцовасці і дакладнага часу паказвалі, з аднаго боку, ход наступлення часцей германскага вермахта, а з другога – вызначалі дакладныя рубяжы абароны Чырвонай арміі ў прывязцы да беларускіх населеных пунктаў і геаграфічных назваў. Як бачна, выкарыстанне нават гэтых даных павялічвае магчымасці для як пашырэння канкрэтных гістарычных фактаў, ўдакладнення геаграфічных рубяжоў адступлення савецкіх часцей, так і самае істотнае – паглыблення ведаў аб асобных баявых падзеях у першыя тры дні вайны на тэрыторыі Беларусі.

У той жа час узнікаюць новыя пытанні даследчыцкага кшталту, напрыклад: на што ў далейшым неабходна абапіраліся гісторыкам пры навуковай верыфікацыі гістарычных падзей; ці можна шырока выкарыстоўваць звесткі, калі яны не прайшлі адпаведны навуковы аналіз ў працах прафесійных даследчыкаў, але зноў і зноў паўтараюцца ў публікацыях рознага кшталту? Аб важнасці навуковай верыфікацыі фактаў на прыкладзе мемуарнай літаратуры ў сучаснай беларускай гістарыяграфіі ўжо распачаты неабходны навуковы дыскурс [1; 3; 4], працяг якога дасць магчымасць не толькі адказаць на пастаўленае вышэй прынцыпова важнае пытанне, але і на навуковых падыходах стварыць каркас праверанага гістарычнага наратыву з апорай на аб’ектыўныя веды аб гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.


1. Брест. Лето 1941 г. Документы. Материалы. Фотографии / сост.: К. Ганцер [и др.]. – 2-е изд., испр. – Смоленск : Инбелкульт, 2017. – 728 с.
2. Великая Отечественная война 1941–1945 годов : в 12 т. – Т. 2 : Происхождение и начало войны. – М. : Кучково поле, 2012. – 1008 с.
3. Новікаў, С. Я. Летнія баі 1941 г. на Беларусі ў мемуарах Г. Гудэрыяна і дзённіку баявых дзеянняў 2-й танкавай групы: спроба кампаратыўнага аналізу // С. Я. Новікаў // Беларускі гістарычны часопіс. – 2014. – № 5. – С. 33–41.
4. Новікаў, С. Я. Беларусь улетку 1941 года: новыя падыходы ў даследаванні баявых дзеянняў. – 2-е выданне, выпраўленае, дапоўненае / С. Я. Новікаў. – Смаленск : Інбелкульт, 2015. – 436 с.
5. Сандалов, Л. М. На московском направлении / Л. М. Сандалов. – М. : Вече, 2010. – 576 с.
6. 1941 год: Страна в огне : в 2 кн. – Кн. 1 : Очерки. – М. : ОЛМА Медиа Групп, 2011. – 720 с.
7. Федэральны ваенны архіў Германіі (далей – BA-MA). Ostfeldzug: KTB der 2. Pz. Armee v. 22. 6. –20.8.1941. – RH 21–2 /927. – Bl. 1–280.
8. BA-MA. Darstellung der Ereignisse am 21.06.1941. – RH 21–2 /927. – Bl. 11–17.
9. BA-MA. Darstellung der Ereignisse am 22.06.1941. – RH 21–2 /927. – Bl. 20–27.
10. BA-MA. Darstellung der Ereignisse am 23.06.1941. – RH 21–2 /927. – Bl. 30–35.
11. BA-MA. Darstellung der Ereignisse am 24.06.1941. – RH 21–2 /927. – Bl. 37–41.


**Крыварот А. А.**

## АРХІЎНЫЯ ДАКУМЕНТЫ ЯК ВАЖНАЯ КРЫНІЦА ДАСЛЕДАВАННЯ БАЯВОЙ САДРУЖНАСЦІ САВЕЦКІХ ПАРТЫЗАН НА ВІЦЕБШЧЫНЕ (1941–1942 ГГ.)

Тэрыторыя Віцебшчыны ў гады вайны стала месцам сумеснага змагання партызан Беларусі, Расіі, Латвіі, Літвы супраць германскіх акупантаў. Інфармацыя аб формах узаемадзеяння партызан суседніх рэспублік утрымліваецца ў дакументах фондаў Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь (далей НАРБ), у тым ліку 4п, 1336, 1391, 1450: данясеннях, рапартах, журналах баявых дзеянняў, баявых распараджэннях, справаздачах, даведках, лістах-допытах і. г.д. Пад тэрмінам «Віцебшчына» неабходна разумець сучасную тэрыторыю Віцебскай вобласці.

У фондах НАРБ аб узаемадзеянні савецкіх партызан на тэрыторыі Віцебшчыны ў першы год вайны захоўваюцца нешматлікія архіўныя звесткі, і датычацца яны ўсходніх раёнаў. Інфармацыя адносіцца да сумеснай дзейнасці са спецпадраздзяленнямі, якія былі закінуты на ўсход рэгіёна з савецкага тылу летам – восенню 1941 г. Самы ранні такі факт змешчаны ў фондзе 1391 (воп. 1, спр. 136), дзе захоўваецца пасляваенны ліст камандзіра разведгрупы М. І. Кавалёва. Дакумент



Рэпазіторый ВДУ

пацвярджае, што з гэтым падраздзяленнем дэсантнікаў, сфарміраваным з камсамольцаў-дабраахвотнікаў Масквы, устанавіла сувязь патрыятычная група колькасцю шэсць чалавек з вёскі Сімакі Машканскага сельсавета (кіраўнік групы А. А. Няхаеў). Разведгрупа прыбыла 21–22 жніўня 1941 г. у Багушэўскі раён. Партызаны дапамаглі парашутыстам сабрацца пасля няўдалага прызямлення, разам выконвалі баявыя заданні на шашэйных дарогах раёна, забяспечвалі дэсантнікаў разведдадзенымі, прадуктамі. У кастрычніку 1941 г. у сувязі з карнай аперацыяй разведгрупа выйшла за лінію фронта [11, л. 6, 9–12].

У гэтым самым раёне 4–5 верасня 1941 г. тры атрады правялі напад на Багушэўск, аб чым згадана ў фондзе 4п (воп. 33а, спр. 74 «Докладная записка секретарей Богушевского райкома КП(б)Б и дневник работы секретаря райкома по кадрам Прохоренко…18 сент. 1941–11 март. 1942»). Сярод гэтых падраздзяленняў былі Багушэўскі атрад, сфарміраваны з актыву раёна (камандзір сакратар райкама КП(б)Б А. К. Стэльмах), атрад акружэнцаў і мясцовых жыхароў на чале з капітанам П. С. Гапонцавым і атрад Заходняга фронту пад камандаваннем малодшага лейтэнанта І. Ф. Бяляева. У выніку налёту на райцэнтр былі ліквідаваны чатыры нямецкія салдаты і афіцэр, а таксама дзве машыны з акупантамі, якія былі выпраўлены на падмогу гарнізону [1, л. 3, 7].

Інфармацыя аб дзейнасці армейскага атрада Разведупраўлення Чырвонай Арміі на чале з Р. М. Ліньковым восенню–зімой 1941 г. на тэрыторыі Віцебшчыны ўтрымліваецца ў фондзе 4п (воп. 33а, спр. 175) і фондзе 1450 (воп. 4, спр. 68, 365). Асноўная частка падраздзялення складалася з рабочых і служачых Масквы. У справаздачы аб рабоце камісара атрада Кеймаха змешчаны дадзеныя аб узаемадзеянні з мясцовымі партызанскімі групамі на тэрыторыі Бешанковіцкага, Сененскага, Чашніцкага раёнаў. Згадана, што да канца кастрычніка 1941 г. атрад шляхам уключэння ў свой склад груп з мясцовых актывістаў і акружэнцаў вырас да 110 чалавек. У вёсках былі створаны групы народнага апалчэння, якія разбуралі драўляныя масты і лініі сувязі. У пачатку лістапада 1941 г. атрад у сувязі з пераследам карнікаў, цяжкасцямі забеспячэння прадуктамі, а таксама для лепшай манеўранасці падзяліўся на тры групы, якія пэўны час дзейнічалі аўтаномна. Справаздача Д. І. Кеймаха была зроблена ў лютым 1942 г. пасля таго, як ён выйшаў у савецкі тыл для ўстанаўлення сувязі з Цэтрам (радыёстанцыя атрада была пашкоджана пры дэсантаванні). Гэта найбольш змястоўны архіўны дакумент аб узаемадзеянні атрада Р. М. Лінькова і мясцовых партызан у 1941 г. [3, л. 221–222].

У лісце-гутарцы з І. С. Саламонавым (аформлены ў савецкім тыле ў канцы 1942 г.) згадана аб яго сустрэчы з Р. М. Ліньковым 18 верасня 1941 г. на другі дзень высадкі дэсанта. Мясцовы актывіст прывёў факты арганізацыйнага ўзаемадзеяння падраздзялення Р. М. Лінькова і мясцовых партызанскіх атрадаў і груп. У дакуменце ўтрымліваюцца звесткі аб тым, што ў атрад Лінькова пэўны час уваходзіла група В. В. Шчарбіны, якая ў снежні 1941 г. пачала перамяшчэнне ў бок лініі фронту [19, л 12].

Некаторыя звесткі аб атрадзе Р. М. Лінькова сустракаюцца ў лісце-гутарцы, праведзенай 6 ліпеня 1943 г. у БШПР з камандзірам 1-й брыгады асобага прызначэння А. П. Брынскім. Так, у дакуменце згадана, што група ваенных і мясцовых жыхароў на чале з акружэнцам маёрам А. П. Брынскім дзейнічала восенню–зімой 1941 г. у складзе атрада Р. М. Лінькова і падарвала пяць мастоў [22, л. 211].

Каштоўнасць дакументаў аб узаемадзеянні партызанскіх атрадаў і груп з падраздзяленнямі, закінутымі з савецкага тылу ў жніўні–верасні 1941 г., заключаецца ў тым, што яны былі складзены «па гарачых слядах» (за выключэннем аднаго) на працягу 1942–1943 г. на аснове сведчанняў актыўных удзельнікаў барацьбы супраць германскіх акупантаў у першы год вайны. Архіўная інфармацыя дае магчымасць пашырыць досвед аб разгортванні партызанскага руху на ўсходзе Віцебшчыны ў 1941 г.

На пашырэнне ўзброенай барацьбы супраць акупантаў у 1942 г. істотна паўплывалі наступныя фактары. Па-першае, пасля контрнаступлення войск Краснай Арміі зімой 1941/1942 г. яе перадавыя часці падышлі да межаў Віцебскай вобласці і разам з партызанамі Віцебскай і Смаленскай абласцей утварылі «Віцебскія вароты» (40-кіламетровы пралом у лініі фронта). З савецкай тэрыторыі праз «вароты» у 1942 г. на Віцебшчыну праніклі дзясяткі падраздзяленняў, сфарміраваных партыйнымі і камсамольскімі органамі розных рэгіёнаў РСФСР. Па-другое, масавы характар набыла адпраўка армейскіх і чэкісцкіх груп, якія раней абаранялі Маскву. Па-трэцяе, пасля няўдалых спроб перакінуць літоўскія і латышскія групы на акупаваную тэрыторыю балтыйскіх рэспублік паветраным шляхам Цэнтр вырашыў выкарыстаць для гэтых мэтаў тэрыторыю Віцебшчыны.

Большасць падраздзяленняў, перакінутых з Вялікай зямлі ў 1942 г., падчас знаходжання на беларускай зямлі ў розных формах ўзаемадзейнічала з мясцовымі партызанамі, што знайшло сваё адлюстраванне ў сотнях дакументаў фонду 4п, 63, 1336, 1391, 1450.

У палітданясеннях, справаздачах, даведках, успамінах удзельнікаў партызанскага руху ўтрымліваюцца звесткі аб тым, што з сярэдзіны сакавіка 1942 г. ва ўсходнія раёны вобласці для разгорвання партызанскага руху і дыверсійнай дзейнасці на камунікацыях рашэннем Ваеннага савета



Рэпазіторый ВДУ

4-й ударнай арміі былі накіраваны падраздзяленні Смаленскай вобласці. Сярод першых прасачыліся на беларускую тэрыторыю атрады «Радзіма» (камандзір А. Ф. Данукалаў) і «Смерць ворагам» (камандзір Я. М. Антоненка), якія на тэрыторыі Лёзненскага раёна аб'ядноўвалі мясцовыя партызанскія групы і падраздзяленні воінаў-акружэнцаў [11, л. 19, 21, 31, 41; 8 л. 16].

Маюцца дакументальныя сведчанні, што на працягу вясны–лета 1942 г. актыўна займалася пашырэннем партызанскага руху на тэрыторыі Віцебшчыны 2-я Смаленская брыгада (камандзір В. В. Стралкоў), якая падпарадкоўвала сваю дзейнасць Ваеннаму савету 4-й ударнай арміі. Ад брыгады на тэрыторыю Багушэўскіх лясоў і ў раён Оршы былі закінуты пяць груп агульнай колькасцю 63 чалавекі, а ў Лёзненскі раён атрад на чале з пракурорам Панізаўскага раёна Смаленскай вобласці І. Р. Чарнышовым. Разам з арганізацыйнай работай падраздзяленні смаленскіх партызан сумесна з мясцовымі групамі праводзілі баявыя аперацыі [2, л. 129, 140; 3, л. 130; 15, л. 123].

Асноўным месцам баявога ўзаемадзеяння беларускіх і смаленскіх партызан у 1942 г. быў трохкутнік Віцебск–Орша–Смаленск, дзе праходзілі важнейшыя стратэгічныя камунікацыі германскіх войск. У архіўных дакументах знайшлі адлюстраванне сумесныя аперацыі на чыгуначных і шашэйных дарогах, напады на акупацыйныя гарнізоны. Летам 1942 г. у трохкутніку дзейнічала пяць беларускіх партызанскіх фарміраванняў, у тым ліку брыгады К. С. Заслонава, А. Ф. Данукалава, пяць атрадаў Смаленскай вобласці, сярод якіх былі падраздзяленні М. В. Антоненкава, А. Г. Саўчанкі, а таксама чэкісцкая і армейская групы [8, л. 45; 9, л. 316–318; 14, л. 4; 16, л. 51–53].

У баявых данясеннях смаленскага атрада «Перамога» (камандзіры Рыбакоў, К. І. Новікаў), а таксама ў гісторыі гэтага падраздзялення ўтрымліваюцца звесткі аб падрыве за лістапад–снежань 1942 г. трох эшалонаў на лініі Крынкі–Заольша, разбурэнні маста на шашы Віцебск – Смаленск у раёне Заольша, нападах у жніўні 1942 г. на апорныя пункты акупантаў у Фокіне, Уне, Пагосцішчах, Красынях на тэрыторыі Лёзненскага раёна. У гэтым і іншых аперацыях атрада ўдзельнічалі партызаны з брыгады А. Ф. Данукалава [5, л. 365–366; 15, л. 49, 51, 52, 61, 89, 91,92].

Архіўныя звесткі ўказваюць на тое, што першыя кантакты беларускіх і калінінскіх партызан адбыліся ў пачатку 1942 г. Група В. В. Шчарбіны падчас перамяшчэння з Лепельскага раёна ў бок лініі фронту на тэрыторыі Тарапецкага раёна 10 студзеня 1942 г. часова ўвайшла ў склад мясцовага атрада [2, л. 3]. Такія кантакты ў пачатку 1942 г. мелі месца і на поўначы Віцебшчыны. Па архіўных дадзеных атрад Ідрыцкага раёна на чале з С. Б. Майсеенкам быў арганізаваны 8 студзеня 1942 г. На тэрыторыі Асвейскага і Расонскага раёнаў атрад папаўняў свае шэрагі групамі мясцовых патрыётаў. Вясной 1942 г. па ініцыятыве С. Б. Майсеенкі быў створаны атрад у Расонскім раёне, у складзе якога былі П. М. Машэраў і С. Б. Пятроўскі. У маі 1942 г. два атрады аб'ядналіся ў раёне вёскі Малінкі ў атрад «Сяргееўскі» [4, л. 10–11, 16–23, 56; 12, л. 14; 20, л. 4, 9, 13].

У архіўных дакументах утрымліваюцца звесткі аб баявым узаемадзеянні беларускіх і калінінскіх партызан на поўначы і паўночным усходзе Віцебшчыны ў 1942 г. Так, 25 сакавіка атрад на чале з М. І. Дзячковым і група партызан Невельскага раёна правялі паспяховы налёт на гарнізон у пасёлку Лехава на граніцы Віцебскай і Калінінскай абласцей і нанеслі немцам значны ўрон [2, л. 18, 136; 16, л. 1]. У чэрвені 1942 г. беларускімі і калінінскімі атрадамі ўзгоднена было праведзена 10 падрываў рэек на чыгуначнай лініі Полацк–Невель, у выніку чаго прапускная здольнасць участка істотна знізілася. Беларуская дыверсійная брыгада ў ліпені 1942 г. рыхтавала падрыўнікоў для калінінскіх атрадаў. З другой паловы 1942 г. калінінскія брыгады сталі рэгулярна атрымліваць грузы з Вялікай зямлі праз аэрадром Сяляўшчына ў Расонскім раёне [8, л. 19–20].

З данясення атрада імя Фрунзе Асвейскага раёна вынікае, што латышскія партызаны сталі ўдзельнічаць у барацьбе супраць германскіх акупантаў на тэрыторыі Віцебшчыны з вясны 1942 г. У беларускім падраздзяленні была група з 32 латышоў на чале з А. М. Громам, якая перайшла з Латвіі і знаходзілася ў атрадзе як аўтаномная баявая адзінка. Латышская група сумесна з беларускімі атрадамі імя М. В. Фрунзе і імя М. А. Шчорса, падраздзяленнем калінінскіх партызан удзельнічала 12 чэрвеня 1942 г. у нападзе на паліцэйскую ўправу ў латвійскім мястэчку Палашчына, 14 чэрвеня вяла бой супраць карнага атрада каля вёскі Лісна Асвейскага раёна, праводзіла дыверсіі на шашэйных дарогах і рабіла налёты на апорныя пункты ворага [12, л. 4; 13, л. 16].

У архіўных справах па Вілейскай вобласці ўтрымліваюцца звесткі, што асноўным месцам узаемадзеяння беларускіх і літоўскіх партызан у 1942 г. быў Браслаўскі раён. У казянскіх лясах у верасні–лістападзе 1942 г. сумесна дзейнічалі атрад «Спартак», падраздзяленне літоўскіх партызан на чале з Й. Арлаўскасам і група латышскіх партызан І. Бараноўскага. У дакументах адзначана, што за гэты час імі былі праведзены дыверсіі на камунікацыях Вільнюс–Даўгаўпілс, Полацк–Вільнюс, 15 аперацый супраць апорных пунктаў акупантаў, у тым ліку ў Казянах, Йодах, Воспе, разгромлены зводны атрад паліцыі каля вёскі Возерава. У дакументах галоўнай прычынай, па якой партызанскім падраздзяленням не ўдалося замацавацца ў рэгіёне і давялося перамясціцца на ўсход Віцебшчыны,



Рэпазіторый ВДУ

называецца буйная карная экспедыцыя, якую акупанты правялі ў трэцяй дэкадзе лістапада 1942 г. [19, л. 144, 159, 172аб; 21, л. 12, 12аб, 18аб, 20, 289, 311, 313аб, 314 аб].

Закінутыя на працягу 1942 г. атрады і групы з Вялікай зямлі у раёнах сваёй дыслакацыі дапамагалі мясцовым групам і атрадам зброяй і боепрыпасамі, у падрыхтоўцы падрыўнікоў, наладжванні сувязі з Цэнтрам, умацоўванні партызанскіх фарміраванняў, выступалі ініцыятарамі правядзення сумесных баявых аперацый. Найбольшая колькасць інфармацыі ў архіўных матэрыялах (фонды 4п і 1450) захоўваецца аб дзейнасці атрада на чале з А. І. Петраковым, накіраванага Ваенным саветам 29-й арміі Калінінскага фронта, і аб падраздзяленні НКУС СССР (камандзір М. С. Пруднікаў). Гэтыя атрады былі сфарміраваны ў асноўным з жыхароў Масквы [6, л. 108; 7, л. 12–13, 32, 35–36; 8, л. 39, 47–48; 12, л. 1–3; 13, л. 153–154; 15, л. 29; 18, л. 1–3; 20, л. 32].

Заўважны след на Віцебшчыне ў жніўні–верасні 1942 г. пакінуў маскоўскі рэйдавы атрад «Баявы» (камандзір А. К. Флегантаў), што знайшло сваё адлюстраванне ў дакументах. Падчас перамяшчэння на тэрыторыю Міншчыны атрад правёў выніковыя дыверсіі на камунікацыях у Віцебскай вобласці сумесна з партызанамі брыгад С. М. Кароткіна і Ф. Ф. Дуброўскага [3, л. 157; 23, л. 48, 50, 54]. Першымі сярод сібірскіх партызанскіх падраздзяленняў прыбылі на тэрыторыю Беларусі камсамольскія атрады – Новасібірскі імя С. Г. Лазо (камандзір І. А. Куксёнак) і Омскі «Сібірак» (камандзір М. Я. Паддубны). Адразу па прыбыцці на тэрыторыю Віцебшчыны ў кастрычніку–лістападзе 1942 г. расійскія атрады сумесна з беларускімі партызанамі сталі праводзіць баявыя аперацыі, што засведчана архіўнымі дакументамі [5, л. 274.10, л. 82; 17, л. 2–8, 247].

На аснове разглежданых дакументальных сведчанняў можна сцвярджаць, што Віцебшчына ў 1941–1942 г. была важным плацдармам прасоўвання партызанскага руху на тэрыторыі Беларусі і суседніх савецкіх рэспублік, адыграла значную ролю ў заснаванні восенню 1942 г. Брацкага партызанскага краю.


1. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ) – Ф. 4п. Воп. 33а. Спр. 4
2. НАРБ. – Ф. 4п. Воп. 33а. Спр. 158
3. НАРБ. – Ф. 4п. Воп. 33а. Спр. 175
4. НАРБ. – Ф. 4п. Воп. 33а. Спр. 176
5. НАРБ. – Ф. 4п. Воп. 33а. Спр. 177
6. НАРБ. – Ф. 4п. Воп. 33а. Спр. 179
7. НАРБ. – Ф. 4п. Воп. 33а. Спр. 523
8. НАРБ. – Ф. 4п. Воп. 33а. Спр. 660
9. НАРБ – Ф. 63. Воп. 9. Спр. 2
10. НАРБ. – Ф. 1391. Воп. 1. Спр. 136
11. НАРБ. – Ф. 1450. Воп. 2. Спр. 1249
12. НАРБ. – Ф. 1450. Воп. 2. Спр. 1251
13. НАРБ. – Ф. 1450. Воп. 3. Спр. 136
14. НАРБ. – Ф. 1450. Воп. 3. Спр. 179
15. НАРБ. – Ф. 1450. Воп. 4. Спр. 15
16. НАРБ. – Ф. 1450. Воп. 4. Спр. 20
17. НАРБ. – Ф. 1450. Воп. 4. Спр. 27
18. НАРБ. – Ф. 1450. Воп. 4. Спр. 68
19. НАРБ. – Ф. 1450. Воп. 4. Спр. 72
20. НАРБ. – Ф. 1450. Воп. 4. Спр. 76
21. НАРБ. – Ф. 1450. Воп. 4. Спр. 365
22. НАРБ. – Ф. 1450. Воп. 4. Спр. 373.



**Корсак А. И.**


## ОПЕРАТИВНЫЕ СВОДКИ СЕВЕРО-ЗАПАДНОЙ ГРУППЫ ЦК КП(Б)Б И СНК БССР КАК ИСТОЧНИК ПО УЧЕТУ ПОТЕРЬ ПАРТИЗАН И МИРНОГО НАСЕЛЕНИЯ[1]

Проблема подсчета потерь до сих является актуальной, не смотря на значительный спектр публикаций в данном направлении. Спор вызывают как потери на фронтах, так и потери на оккупированной нацистами территории Советского Союза в целом, и Беларуси в частности.

Особую проблему, на наш взгляд, вызывают потери партизан и мирного населения, произвести подсчет которых более сложно, чем воинов Красной армии. В первую очередь это связано с разбросом данных в разных источниках.

Потери среди гражданского мирного населения, как правило, анализировались по Актам Чрезвычайной государственной комиссии. По крайней мере, в советской историографии и


[1] Исследование выполнено при финансовой поддержке БРФФИ и РФФИ в рамках проекта № Г20Р-287 «Народ и власть: оккупанты, коллаборационисты и партизаны на пограничной территории Беларуси и северо-запада России в 1941–1944 гг. ».





Репозиторий ВГУ